Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

УДК 7.046

# СЯМЕЙНАЯ ТРЫЯДА Ў ЯЗЫЧНІЦКАЙ РЭЛІГІІ

**Барадзін Юрый Сігізмундавіч**
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў (г. Мінск, Беларусь)

*Кароткая анатацыя: паказаць узаемасувязі і падабенствы язычніцкіх трыяд у старажытных рэлігіях розных народаў, а таксама, індаеўрапейскай сям'і. Аб'ектам даследавання выступае язычніцкі пантэон багоў. У публікацыі аўтар звяртаецца да трыяды галоўных багоў у беларускай, скандынаўскай, і іншых міфалогіях свету. Праз навуковы твор французскага міфолага Жоржа Дзюмезіля «Верховные боги индоевропейцев» працягваецца даследаванне індаеўрапейскай трыяды.*

З старажытных часоў, калі існавала язычніцтва, продкі пакланяліся пантэону багоў, згрупаваным па трыядам. Самай распаўсюджанай з'явай у язычніцкай рэлігіі з'яўляецца аб'яднанне трох галоўных бостваў у адзінае цэлае, што сімвалізуе духоўны пачатак.

Да з'яўлення язычніцкай трыяды ў ва ўсіх міфалогіях свету спачатку няма нічога, акрамя змроку і хаосу, з якога ў скандынаўскай міфалогіі з'явілася карова Аўдумла, якая паспрыяла з'яўленню першапродка багоў – Буры – бацькі перша-

бога-аса Бора, праз шлюб якога з волаткай Бестлай (дачкі волата Бёльтарна) з'явілася першапчатковая скандынаўская трыяда багоў: Одзін, Ві і Белі. Яны адносяцца да трыяды стваральнікаў скандынаўскага свету. Забіўшы волата Іміра, з пасечаных яго частак стварылі космас. Затым, трыяда сыноў Бора і ўнукаў Буры ствараюць чалавека.

Пасля таго, як быў створаны космас і пачалося нараджэнне іншых багоў, скандынаўская трыяда змянілася такім чынам: Одзін, Тор і Фрэйр [1, с.59]. Яны сталі традыцыйнай трыядай скандынаўскага пантэону. З усёй трыяды Одзін з'яўляецца вярхоўным богам вікінгаў, а таксама Ўсебацькам скандынаваў і ўсіх багоў [1, с. 141]. Язычніцкія святары прыносяць яму ахвяры. Тых ваяроў, што памерлі з мячом у руцэ, прымае ў свой палац – Вальхалла, дзе душы вікінгаў завуцца «эйнхерыямі». Як бог-суддзя, Одзін вырашае лёс людзей. Функцыі бога вайны ён перадаў свайму сыну – грамабою Тору, які ўзначальвае касту ваяроў [1, с. 139]. Тор, таксама, уладальнік свяшчэннага молата «Мельёнір», з якога ён пасылае маланкі і гром, абараняючы людзей і багоў ад волатаў і пачвараў.

Одзін і Тор адносяцца да вышэйшых багоў – асаў. Фрэйр – адначасова бог сонца і лета, заступнік касты земляробаў. Разам з бацькам Ньёрдам (богам ветру і марскіх стыхій) і сястрой Фрэйяй (валадаркай Сесрумніра і поля народнага «Фольскванг) Фрэйр адносіцца да трыяды ніжэйшых багоў – ванаў [1, с. 140].

Да жаночай трыяды ў скандынаўскай міфалогіі адносяцца тры норны (багіні лёсу): Урд (лёс), якая прадзе ніткі лёсу; Вердандзі (якая скручвае ніткі) і Скульд (якая абразае нітку). Яны вырашаюць лёсы багоў і людзей. Валадарка скандынаўскага пекла – Хель, воўк Фенрыр і змей Ярмуганд – дзеці бога Локі і волаткі Ангрбоды ўзначальваюць у скандынаваў трыяду зла. У Хель пакутуюць душы тых вікінгаў, што памерлі без зброі ў руках, і ніколі не патрапілі ў Вальхаллу. Фенрыр і Ярмуганд будуць галоўнай пагрозай для знішчэння скандынаўскага і свету і гібелі багоў: у апошняй бітве паміж багамі і волатамі «Рагнарок» Одзіна ў бітве воўк праглыне; Тор пераможа сусветнага змея Ярмуганда, і загіне разам з ім; Фрэйр загіне ад вогненнага мяча волата Сурта (валадара Муспельхейма). Пасля таго, як ранні скандынаўскі свет згарыць у агні, услед за ім народзіцца новы свет скандынаваў, у якім ўладу ад Одзіна ўспадкуюць сыны – уваскрослыя бог-вясны Бальдр і сляпы бог зімы – Хёд, багі помсты – Валі і Відар, а таксама ўнукі Одзіна і сыны Тора – Модзі і Магні разам з молатам бацькі «Мельёнір» [6, с. 244]. Ад Фрэйра, яго жонкі – волаткі Гёрд і іх сына – Фьёльніра – валадара шведскай Упсалы працягваецца радавод нарвежска-шведскіх конунгаў (правадыроў вікінгаў) праз дынастыю Інглінгаў.

Спасылаючыся на скандынаўскую трыяду, французскі міфолаг – Жорж Дэмюзь, прыйшоў да высновы, што індаеўрапейскае грамадства, у якое разам са скандынавамі ўваходзяць індыйцы, грэкі, рымляне, армяне, беларусы і іншыя славянскія плямёны падзялілася на тры функцыянальныя саслоўі: брахманы (вярхоўныя слугі багоў), кшатрыі (ваяўнічая каста) і вайш'і (каста земляробаў) [1, с. 30]. Кожнай язычніцкай касце падыходзіла адпаведнае боства.

Падобныя супадзенні, як у скандынаўскай трыядзе (Одзін, Тор, Фрэйр) назіраюцца і ў іншых індаеўрапейскіх міфалогіях. Сямейную трыяду старажытных грэкаў узначальваюць Зеўс, Афіна і Апалон [6, с. 116]. Зеўс як і Одзін – вышэйшы бог-суддзя ў касце жрацоў. Алімп – старажытна-грэцкі варыянт скандынаўскай



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Вальхаллы. Калі Одзін разам з Фрэйяй дзялілі частку паўшых ваяроў, то Зеўс нікога з грэкаў, акрамя свайго сына – Геракла, не прымаў у Алімп [6, с. 135]. Душы ўсіх памерлых грэкаў ў валадарстве брата Зеўса – змрочнага Аіда (грэцкі варыянт скандынаўскага Хель). Вайсковай кастай у трыядзе старажытнай Грэцыі адносіцца багіня вайны і заступніца перамогі – дачка Зеўса – Афіна. Апалон як Фрэйр – бог сонца, які адначасова заступаецца за земляробаў.

У старажытных рымлян, язычніцкі пантэон якіх вельмі падобны на пантэон грэкаў, сямейную трыяду займаюць Юпітэр, Марс і Квірын [1, с. 114]. Юпітэр – рымскі Зеўс, як бог-суддзя. Рымскі Марс як Тор і Афіна, на баку ваяроў. Узор Фрэйра і Апалона – сын Марса – Квірын. Першапачатковая «Капіталійская» трыяда ў Капіталійскім храме ў старажытных рымлян выглядае так: Юпітэр, Мінерва (рымскі варыянт грэчаскай Афіны), Юнона (багіня шлюбу і ўрадлівасці). Падобна да «Упсальскай трыяды» адносяць Одзіна, Тора і Фрэйра, паколькі ў Упсале ў іх было агульнае язычніцкае капішча [1, с. 138].

Да сямейнай трыяды армянскіх багоў адносяцца Міхр (бог правасуддзя), Ваагн (бог вайны) і Спандарамет (бог земляробаў).

У індыйскую трыяду ўваходзяць парныя (двайныя багі). Да касты жрацоў адносяцца Мітра і Варуна, за ваяроў – Індра і Агні, два бога Ашвіна – за земляробаў. Першую трыяду індыйскіх багоў называюць «Трымурці», у якой стваральнік, захавальнік і разбуральнік свету: Брахма, Вішну і Шыва [4, с. 26].

Да індаеўрапейскай міфалогіі мае дачыненне, таксама, і балцкая міфалогія, у трыядзе якой – вярхоўны бог – Дзіевас, бог ваяроў – Пяркунас і багіня ўрадлівасці, жанчын і зямлі – Жэміна [3, с. 4]. Да жаночай трыяды багінь як і ў скандынаўскай міфалогіі, у балтаў тры багіні лёсу: Лайма (багіня шчасця), Дэкла (заступніца дзяўчат, выбірае жаніха) і Карта (вырашае лёс людзей).

У беларускай і славянскай міфалогіі, якая з'яўляюцца часткай індаеўрапейскай сям'і, язычніцкая трыяда пачынаецца са стваральнікаў космасу: першабог – Род, і яго сыны – Белбог і Чарнабог. Затым, трыяду ўзначальваюць Сварог, Пярун і Дажбог. Сварог – вярхоўны бог-суддзя як Зеўс, Юпітэр і Одзін. Пярун -беларускі і славянскі варыянт Тора, Марса і Афіны, якога ўшаноўвалі заступніка славянскай і княжацкай дружыны. Дажбог, падобна Фрэйру, Апалону і Квірыну – бог сонца і заступнік земляробаў [5, с. 25]. Славянская трыяда свету падобная на скандынаўскую. У славянаў – Явь (свет людзей) [5, с. 28], Правь (свет багоў) [5, с. 29], Навь (падземны свет) [5, с. 27]. У трыядзе скандынаваў касмаганічная вертыкаль свету: Асгард (свет багоў), Мідгард (свет людзей) і Хельхейм (пекла скандынаваў).

У старажытна-егіпецкай і кітайскай міфалогіі ёсць адрозненні трыяд. У Егіпце распаўсюджаная трыяда такім чынам: бог-бацька, багіня-маці і бог-сын [2, с. 221]. Першапачатковая трыяда егіпцян выглядала такім чынам: Асірыс (вышэйшы бог-суддзя), Ісіда (культ мацярынства) і Гор (бог неба і сонца). Пазней, з'яўляецца мемфіская трыяда: Птах (бог-стваральнік свету), Сахмет (багіня вайны) і Нефертум (бог раслінаў) [2, с. 108]. Затым, канчатковай трыядай старажытнага Егіпту стала «Фіванская трыяда»: Амон (бог паветра), Мут (багіня неба, заступніца мацярынства) і Хонсу (бог месяца) [2, с. 230]. Кітайская язычніцкая трыяда зорных багоў – «Сань-Сінь» – гэта Лу-Сін (бог кар'еры), Фусін (бог шчасця) і Шоў-сін (бог даўгалецця). Таксама, у міфалогіі кітайцаў распаўсюджаная нябесная трыяда: Ю Цзін, Шан Цзін і Да Цзін [7, с.26].



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Параўноўваючы язычніцкія трыяды розных народаў, можна прыйсці да высновы, што ў беларускай, скандынаўскай і іншых міфалогіях свету сустракаюцца падобныя багі. Адны кіруюць у індаеўрапейскай сям'і жрэцкім, земляробчым і вайсковым саслоўем. Другія, нягледзячы на адрозненне трыяд, маюць падабенствы функцый кіравання светам, якія выконваюць. Адзінае адрозненне скандынаўскіх багоў у тым, што багі вікінгаў – такі я ж смяротныя як людзі, і ў язычніцтве вікінгаў наканаваны канец свету, якога няма ў іншых язычніцкіх міфалогіях. Тым ня менш, як адзначыў французскі міфолаг – Жорж Дзюмезіль, аўтар кнігі «Верховные боги индоевропейцев», міфы розных і сучасных народаў рэканструююца з дапамогай параўнальна-гістарычнага даследавання і дэманструюць дзіўныя падабенствы ў функцыях, якія выконваюць багі язычніцкіх трыяд.

## Літаратура


1. Дюмезиль, Ж. Верховные боги индоевропейцев / пер. с франц. Т.В. Цивьян. – М.: Наука, 1986. – 234 с.
2. Египетская мифология: энциклопедия. – М.: Эксмо, 2002. – 592 с.
3. Иванов, В.В. Исследования в области славянских древностей / В.В. Иванов, В.Н. Топоров. – М.: Наука, 1974. – 342 с.
4. Индийская мифология: энциклопедия. – М.: Мидгард, 2005. – 448 с.
5. Кириков, О.И. Славянская мифология. Астрознахарство жрецов / О.И. Кикиков. – М.: Наука, 2017. – 136 с.
6. Колум, П. Великие мифы народов мира / пер. с англ. Л. А. Горевского. – М.: ЗАО Центрполиграф, 2007. – 351 с.
7. Мифы древнего Китая / пер. с кит. Е.И. Лубо-Лесническо, Е.В. Пузицкого. – М.: Наука, 1963. – 496 с.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова